

Малюнак 3 – Хор «Cantate Domino», дырыжор – Г. Давідовіч. Гродна, 2016 г.



Малюнак 4 – Аўтар з гуртом «Васілёчкі» на канцэрце. Мінск, 2016 г.



Малюнак 5 – На здымках сюжэта «Зажынкі» для Тэлеканала СТВ, 2017 г.

У Танявіцкай святыні была імша за таневічан, падчас якой цудоўна спяваў Богу і каталіцкі хор Гродзенскай дыяцэзіі «Cantate Domino» [2] пад кіраўніцтвам майго таленавітага земляка-аднакласніка Генрыха Давідовіча (мал. 3). Я з задавальненнем распавяла яму і сваім землякам пра сваіх выхаванцаў з дзіцячага гурта «Васілёчкі» (мал. 4) і працу з фальклорным матэрыялам для СМІ Беларусі (мал. 5).

Мы сустракаліся, спявалі, радаваліся, жартавалі, плакалі і дзякавалі Пану Богу за сустрэчу. За тое, што наша вёска Танявічы дала Беларусі і свету шмат таленавітых, разумных і светлых людзей.

**Спіс літаратуры:**


1. Бродель, Ф. Структуры повседневности : возможное и невозможное / Фернан Бродель ; пер. с франц. Л. Куббеля. – М. : Прогресс, 1986. – 234 с.
2. Марціновіч, Ю. Хор «Cantate Domino» выступіў з канцэртам, прысвечаным 100-годдзю аб'яўленняў Марыі ў Фаціме / Юрый Марціновіч // GRODNENSIS.BY [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://grodnensis.by/nawiny/6725-khor-cantate-domino-vystupi-z-kantsertam-prysvechanym-100-goddzyu-ab-ya-lennya-maryi-fatsime.html. – Дата доступу : 24.03.2018.



*Аляксей Камінскі*


## ЖЫЦЦЯЗДОЛЬНАСЦЬ НАРОДНАЙ ТРАДЫЦЫІ Ў КАНТЫНУУМЕ СУЧАСНАЙ СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ


*Аўтар сцвярджае, што жыццяздольнасць народнай святочнай спадчыны, яе трансфармацыя як спосаб перакладу традыцыйных абрадаў на мову сучасных культур прыводзіць да збяднення іх зместу. Але вопыт ашчаднай трансфармацыі сучасных формаў традыцыйнага свята пры пэўных абставінах здольны захаваць працэс развіцця абрадаў, што захаваліся.*



*Alexey Kaminski*


## VIABILITY OF FOLK TRADITIONS IN THE MODERN FESTIVE CULTURE CONTINUUM


*The author claims that the viability of folk festive heritage, with itself a transformation as a way of translating traditional rituals into the language of modern cultures leads to impoverishment of their content. But the experience of saving the modern forms of traditional holidays under certain circumstances can preserve the development process of the surviving rites.*


Традыцыя з'яўляецца асноватворным канструктам культуры і праяўляецца ва ўсіх без выключэння сферах яе жыццядзейнасці. Традыцыйная культура ў сілу сваёй спецыфічнасці і строгай функцыянальнасці займае рэгламентуемае месца ў агульнай неабсяжнай прасторы культуры.

На сучасным этапе народныя традыцыі займаюць усё менш дамінуючыя пазіцыі ў сямейным і грамадскім жыцці насельніцтва. З'яўленне і папулярызацыя разнажанравай масавай культурнай прадукцыі істотна паўплывала на трансфармацыю аўтэнтычнага фальклору, этнаграфічнай і мастацкай спадчыны краіны. Святочныя комплексы эвалюцыяніравалі на працягу апошніх дзесяцігоддзяў XX ст. Да сучаснага перыяду дайшлі толькі рэшткі аўтэнтычнай спадчыны. Да вынаходжання пісьменства перадача інфармацыі была толькі вербальна-варыятыўнай, уплыў на народныя ўяўленні аказаў доўгатэрміновы перыяд аўтарытарнага панавання хрысціянскай рэлігіі.

Рэканструкцыя традыцыйных абрадавых практык дастаткова даўно заняла дастойнае месца ў прасторы святочнай культуры. Спачатку гэта былі фрагменты тэатралізаваных дзействаў або часткі абраду. Гэта спробы тэатралізацыі старога святочнага быту, падрыхтаваныя па тэхналогіі тэатральнага спектакля і арыентаваныя на паказ. Паступова абрады-спектаклі ўцягвалі ў сваю мастацкую прастору структурныя элементы, знойдзеныя ў фальклорна-этнаграфічнай літаратуры і падцверджаныя экспедыцыйнай практыкай, а таксама новыя рухаючыя сілы аб'ектыўна перараслалі ў святочныя масавыя дзействы с развітай драматургічнай фактурай, у якой ужо наўмысна адводзілася месца сімультаннасці і варыятыўнаці. Ускладняліся сцэнарныя хады, узбагачаліся рэжысёрскія прыёмы, устанаўліваліся і правацыраваліся розныя формы камунікацыі, якія дазвалялі мадэліраваць паводзіны прысутных, пераўтвараючы іх з гледачоў у непасрэдных удзельнікаў. Складанасць праблемы заключаецца ў тым, што традыцыйныя святы з цягам часу страцілі сакральны сэнс, ператварыліся ў арыгінальную відовішчна-абрадавую забаву, гульню, арыентаваную на архетыпічную памяць. Дасканалае вывучэнне элемента абрадавага свята ў кантэксце яго архетыпічнай мадэлі – адна з галоўных задач сучасных рэканструктараў.

Аналіз гістарычнай разнастайнасці сакральных абрадаў і рытуалаў дазваляе зрабіць выснову, што яны базіруюцца на адпаведных культах, якія пранізваюць жыццёвыя асновы шматлікіх культур. Сярод іх можна вылучыць групу асноўных:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культ вярхоўнага боства; культ правадыра (улады); культ героя (настаўніка); культ сям'і і дома; культ продкаў; культ прадмета (феціш); фітаморфны і зааморфны культы; працоўныя культы; культ стыхій (агоню, вады, паветра, зямлі); культ тайнага, аказіянальны.

Абрадавыя практыкі вызначаюцца намі як пэўная акцыянальная структура або набор рытуальных дзеянняў. Аналіз фундаментальных навуковых даледаванняў дазваляе вылучыць і згрупіраваць у адвольным парадку асноўныя традыцыйныя абрадава-рытуальныя дзеянні: абрадавае пераапрананне, маскіраванне; пластыка, танец, рытм; ахвярапрынашэнне; адорванне і абмен; рытуальная трапеза, банкетаванне; абсмейванне і парадзіраванне; ачышчальныя і засцерагальныя дзеянні; слоўныя дзеянні; статусныя дзеянні; эратычныя дзеянні; магічныя дзеянні.

«Любы жывы абрад, які выкананы аднойчы, можна разглядаць як адзінкавую рэалізацыю інварыянтыўнай традыцыі. Але інварыянт – умоўная рэканструкцыя, заснаваная на схематызацыі мноства адзінкавых выкананняў» [2, с. 11].

Шматгадовая рэжысёрска-пастановачная, навукова-даследчая і педагагічная дзейнасць прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры рэжысуры абрадаў і свят БДУКМ у галіне рэканструкцыі і рэстаўрацыі рытуальна-абрадавых формаў традыцыйнай святочнай культуры ўпэўнілі ў тым, што ў сучасных умовах пры мадэліраванні традыцыйных свят мы не павінны педантычна і дасканала ўзнаўляць гістарычную рэчаіснасць іх бытавання. Неабходна адаптаваць архаічныя падзеі народнай культуры да сённяшняга дня, суаднесці абрадавую спадчыну ў мастацкім і сацыяльным аспектах з сучаснай свядомасцю новага пакалення. Да нашага часу дайшлі рознаварянтныя мастацкія абрадавыя тэксты, якія сёння ўжо не з'яўляюцца сакральнай гістарычнай асновай рытуальна-абрадавых і святочных практык, яны толькі дапамагаюць стварыць адпаведную атмасферу тэатралізаванага. У варыянце тэарэтычнага мы пагаджаемся з думкай вядомага філосафа культуры, гісторыка рэлігій, этнографа М.Эліядэ аб тым, што міфалагічная аснова традыцыйнага свята павінна пражывацца аўдыторыяй, якая «ахоплена свяшчэннай і натхняльнай магутнасцю ўзноўленых у памяці і рэактуалізаваных падзей… Мы саступаем са свету паўсядзённасці і ўваходзім у перайначны свет, які ўзнік нанова, быў прасякнуты нябачнай прысутнасцю звышнатуральных істот» [3, с. 29]. А ў варыянце практычнага і рэжысёрска-пастановачнага ўзнаўлення народнага свята на сучасным этапе мы зможам дасягнуць пастаўленай звышзадачы – захавання традыцыйнай святочнай спадчыны шляхам дэталёвага вывучэння фальклорна-этнаграфічнай асновы абраду і яе ўвасаблення не ў межах загадзя падрыхтаванага літаратурнага сцэнарыя, а ў стыхійна-імправізаванай форме. Аб'яднаць асобныя эпізоды ў адзіны драматургічны твор па народнай традыцыі здольны толькі адзін чалавек – распарадчык свята. У кожнага сямейна-бытавога свята і свята каляндарнага цыкла існаваў «рэжысёр-пастаноўшчык» – персаніфікаваны персанаж, які кіраваў бурлівым карнавалізаваным святочным дзеяннем: Дзед-пачынальнік, Шчодра, Зюзя, Купаліш і Купалінка, бабка-павітуха, сват і сваццня, галоўная жняя і інш.

Абрадавыя практыкі пранізваюць культуру і наша існаванне. Яны не абавязкова строгія і няўхільныя. Некаторыя з іх бываюць вясёлымі, утрымліваюць элементы гульні і імправізацыі, змяняюцца, перажываюць варыяцыі. Вельмі часта замест капіравання арганізатары ставяць мэту замацавання пэўных сімвалічных дзей, не клапоцячыся аб дакладнасці копіі. Імправізацыя пры трансляцыі абрадавага тэксту, рэалізацыі структурна-кампазіцыйных схем і сюжэтаў з'яўляюцца асноўнымі прычынамі знешняй або ўнутранай трансфармацыі архаічных формаў, якія разглядаюцца не толькі ў аспекце зменлівасці, але ў аспекце ўстойлівасці абраду — сінаніміі розных варыянтаў.

Устойлівасць, гістарычная інертнасць традыцыі, якая з'яўляецца сродкам стабілізацыі грамадскай сістэмы, механізмам фіксацыі і трансляцыі мастацка-гістарычных узораў і практык, спрыяюць штучнаму захаванню, кансервацыі састарэлых мадэляў паводзін, спосабаў мыслення і адчування. Традыцыі народнай культуры аб'ядноўваюць ў сваіх законах уласцівасці і пастаяннага абнаўлення, утвараючы пры гэтым шматпланавую, гістарычна цэласную сістэму, у якой вопыт мінулага, пры неабходнасці, можа быць запатрабаваным і ўзноўленым. Калі традыцыя трапляе пад уздзеянне антысістэмных сіл, яна працягвае захоўваць шматзначнасць сваіх функцый, вытокі жыццёвай сілы на глыбінных узроўнях этнічнага светаадчування і свядомасці, на ўзроўні генатыпу, адраджаючыся у ранейшых формах пры новых спрыяльных умовах, дыялектычна ўплываючы на накіраванасць нацыянальных культурна-гістарычных працэсаў і стрымліваючы ўзнікненне ўяўных, выпадковых навацый.

Трансфармаваныя формы традыцыйных абрадаў не толькі транслююць фальклорны змест у сучасную культуру, але ўтылізуюць і адаптуюць ключавыя складнікі традыцыйнага ў рамках новай культуры, ствараючы новую культуру, якая ўзмацняе ўзаемадзеянне ўсіх відаў і жанраў культурнай творчасці – народнага, самадзейнага і прафесійнага.

Сучасная трансфармацыя традыцыйных абрадаў абумоўлена сацыяльна-псіхалагічным механізмам мастацкай актыўнасці суб'екта, які ўключаны ў кантэкст новых масавых камунікацый. Гэтыя механізмы вызначаюць зменлівыя элементы традыцыйных абрадаў, іх сучасныя варыянты, характэрныя для лакальных супольнасцяў. «Маштаб трансфармацый у сферы традыцыйнай культуры непасрэдна звязаны з мадыфікацыямі самой грамадскай сістэмы, а з'яўленне новых формаў яе прэзентацыі абумоўлена самой сацыякультурнай рэальнасцю. Менавіта таму, нягледзячы на інтэнсіўнае развіццё сродкаў масавай камунікацыі, у сучаснай культуры працягвае актыўна развівацца і той фальклор, які функцыянуе па традыцыйным тыпе» [1, с. 12].

Такім чынам, жыццяздольнасць народнай святочнай спадчыны, яе трансфармацыя як спосаб перакладу традыцыйных абрадаў на мову сучасных культур прыводзіць да збяднення іх зместу. Але тым не менш, вопыт трансфармацыі сучасных формаў традыцыйнай святочнай камунікацыі, хоць і пазбаўленай прыроднай імправізацыі, як ні парадаксальна, захоўвае працэс развіцця абрадаў, што захаваліся. Сёння мы павінны перадаць яго наступным пакаленням, не выключаючы магчымасці вольна-захаваных і ў той жа час рэгламентаваных сучасных варыяцый на сакральныя тэмы і імправізацыйнай пабудовы тэкстаў.

**Спіс літаратуры:**

1. Каргин, А. Научное осмысление интернет-фольклора: актуальные проблемы и опыт исследования / А. Каргин, А. Костина // Интернет и фольклор : сборник научных статей. – М. : ГРЦФР, 2009. – 320 с.
2. Путилов, Б. Проблемы типологии этнографических связей фольклора / Б. Путилов // Фольклор и этнография. Связи фольклора с древними представлениями и обрядами : сб. статей. – Л. : Наука, Ленингр. отд., 1977. – 200 с.
3. Элиаде, М. Аспекты мифа / М. Элиаде. – М. : Инвест-ППП, 1995. – 240 с.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ